# Вершы Гродзеншчыны

**Сталі вядомыя імёны пераможцаў літаратурнага конкурсу «Гродна — культурная сталіца Беларусі 2014», ініцыяванага Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі і праведзенага сумесна з галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама ды Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Я. Карскага.**

Адпачатку конкурсная праграма прадугледжвала дзве намінацыі. Але ў намінацыі «Эсэістыка» конкурс не адбыўся, бо ў літаратурнай палітры сучаснае Гродзеншчыны пераважае паэзія.

Конкурс праходзіў у тры этапы. На першым літаратары — і аматары, і майстры — дасылалі як адзінкавыя творы, так і лірычныя нізкі вершаў, якія размяшчаліся на афіцыйным інтэрнэт-сайце Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Там жа можна было пазнаёміцца з біяграфіямі аўтараў.

На другім этапе конкурсу экспертная камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Гродзенскага аблвыканкама, абласной бібліятэкі, члены СПБ і супрацоўнікі кафедры беларускай літаратуры ГрДУ імя Янкі Купалы, вызначыла пераможцаў, разгледзеўшы .працы 21 канкурсанта.

Тэматычны вечар паэзіі «Табе, наш любы Гродна», прысвечаны заключнаму, трэцяму, этапу конкурсу, адбыўся ў Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці.

Першае месца ў конкурсе аднагалосна было аддадзена члену СПБ, паэтэсе з вёскі Стральцы Мастоўскага раёна Ірыне Данік. Другога ўдастоены паэт, бард, член СПБ Анатоль Апанасевіч, трэцяга — аспірантка ГрДУ імя Янкі Купалы Таццяна Лашук з Ліды. Уладальнікам прыза глядацкіх сімпатый стаў малады паэт з Гродна, член СПБ Антон Янкоўскі. Спецыяльным прызам і дыпломам СПБ уганаравана паэтэса і педагог з вёскі Скрыбаўцы Шчучынскага раёна Наталля Цвірко.

Кожнаму ўдзельніку быў уручаны сімвалічны карт-бланш на далейшае творчае супрацоўніцтва з Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ.

**Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК**